


# Здароўе — галоўная ўзнагарода

**У пачатку красавіка ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі прайшло мерапрыемства, прысвечанае Міжнароднаму дню здароўя, у рамках гарадской маладзёжнай акцыі "Здароўе і маладосць", якое на працягу 12 гадоў праводзіцца ў сектары культурна-масавых мерапрыемстваў.**

Прайшло яно ў форме квест-гульні "Здароўе — галоўнае багацце", удзельнікамі якой сталі навучэнцы 8—10 класаў сталічных школ з усіх раёнаў. Дзецям трэба было прайсці 10 станцый, на якіх неабходна было выканаць заданні — прыклад вядомай фразы "У здаровым целе — здаровы дух!". Потым і самі каманды пры праходжанні станцый "Фізхвілінка", "Дарога да здаровага ладу жыцця", "Меткая" змаглі прадэманстраваць свае фізічныя навыкі і пазмагацца за жаданыя ачкі. На станцыях "Усёзнайка", "Медыцынская", "Здаровыя прыказкі" дзеці паказвалі свае веды ў пытаннях прафілактыкі шкодных звычак, аказання першай медыцынскай дапамогі, прапаганды здаровага ладу жыцця. Адной з папярэдніх умоў удзелу ў гульні была падрыхтоўка лагатыпа і назвы каманды і наяўнасць распазнавальнага колеравага элемента адзення. Па выніках праходжання ўсіх этапаў гульні і падсумавання атрыманых балаў за лагатып вызначыліся пераможцы і прызёры. 1 месца заняла каманда "Ліга здароўя" гімназіі № 7 Партызанскага раёна (кіраўнік — псіхолаг Надзея Аляксееўна Ржэуц-

выканаць заданні — інтэлектуальныя, творчыя, спартыўныя, гумарыстычныя, аб'яднаныя адной тэмай — здароўе. Аўтарам, арганізатарам і ідэйным натхняльнікам акцыі стала малады ініцыятыўны культарганізатар аддзела сацыякультурнай дзейнасці Ганна Баярынцава. Адкрылі мерапрыемства паказальныя выступленні каманды па чырлідынгу NightWoolves Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры — яркі





кая). 2 месца заваявала каманда 9 Style сярэдняй школы № 9 Маскоўскага раёна (кіраўнік — педагог сацыяльны Ірына Юр'еўна Сушчынская), а 3 месца атрымала каманда "Здорава жыць" Цэнтра дадатковай адукацыі "Арт" Першамайскага раёна (кіраўнік — культарганізатар Ірына Алегаўна Глухоўская). Без падарункаў і прызоў не застаўся ніхто. Пераможцам, акрамя падарункаў ад спонсараў, былі ўручаны спартыўныя снарады для падтрымання фізічнага духу — гантэлі і баксёрскія грушы. Хочацца адзначыць, што падтрымаць свае каманды прыехалі шматлікія балельшчыкі з раённых школ. Для іх былі арганізаваны паказальныя выступленні і майстар-класы па футбольным фрыстайле (каманда LifeStyle), паркуры (каманда "Інфініteam"), ад якіх проста займала дух! А віртуознае катанне прадстаўнікоў ролерклуба In Move захапіла ўсіх прысутных і не пакінула абыякавым нікога. Дзяўчынкі і хлопчыкі, якія прыйшлі на свята, цвёрда засвояць, што здароўе — галоўная ўзнагарода!

**Марына МІРОНЧЫК.**